Куракевіч Н.І., кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта Інфарматыкі і Радыеэлектронікі.

# РЭАРГАНІЗАЦЫЯ ШКОЛЬНАЙ СПРАВЫ ВА ЎМОВАХ ПАБУДОВЫ САВЕЦКАГА ГРАМАДСТВА.

У дарэвалюцыйнай Расіі, у складзе якой знаходзілася і Беларусь, існаваў дваранска-памешчыцкі дзяржаўны лад з паўфеадальным укладам жыцця, ён характарызаваў і сістэму адукацыі. Усе класічныя гімназіі, ліцэі, інстытуты, універсітэты, акадэміі рыхтавалі камандны склад памешчыцка-дваранскай дзяржавы па лініі адміністрацыйнага і ваеннага кіравання, культуры і ідэалогіі.

Шырокія працоўныя масы, на долю якіх выпала цяжкая фізічная праца, знаходзіліся па-за гэтай сістэмай прывілеяваных класавых груп і абслугоўваліся толькі пачатковымі школамі, колькасць якіх была надзвычайна мізэрная. У 1896 г. школ па Міністэрству народнай асветы (у межах былой Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў (без Гомельшчыны) было толькі 858 з 56 908 вучнямі і 3 727 школ царкоўных з 74 096 вучнямі) [1, арк. 37]. Паводле звестак перапісу 1897 г., агульная колькасць пісьменных у Беларусі складала толькі 25,7% ад усяго насельніцтва.

У пачатку XX стагоддзя ўзнікла патрэбнасць у змяненні сістэмы асветы. Буржуазія, якая вяла барацьбу за ўладу, адначасова вяла барацьбу і за сістэму асветы. З'явіліся ніжэйшыя і сярэднія тэхнічныя школы, рэальныя і камерцыйныя вучылішчы, тэхнічныя інстытуты, прычым значная частка навучальных устаноў арганізоўвалася на асабістыя сродкі. Пад націскам патрэб эканамічнага развіцця паляпшаўся стан адукацыі. З 1900 да 1914 гг. колькасць пачатковых і сярэдніх школ усіх тыпаў, уключаючы прыватныя, павялічылася ў Віленскай навучальнай акрузе з 6 297 да 7 593, а навучэнцаў у іх - з 248 тысяч да 490 тысяч. А колькасць народных вучылішч павялічылася адпаведна з 1 075 да 4 784 [2, с. 207]. Важную ролю ў пашырэнні пачатковай адукацыі адыгралі земскія школы, створаныя ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях. Земствы складалі планы па ўвядзенню ўсеагульнай

адукацыі і месцамі выконвалі іх даволі паспяхова [3].

Перад пачаткам першай сусветнай вайны справа народнай асветы на тэрыторыі Беларусі значна палепшылася. Але ж гэтага было недастаткова. У 1914/15 навучальным годзе ва ўсходніх губернях Беларусі налічвалася толькі 4 176 школ, у якіх набывалі адукацыю крыху больш за 266 043 чалавекі. Гэта складала менш за палову ўсіх дзяцей школьнага ўзросту [4, с.11]. Для асветы трэба было зрабіць шмат, таму што згодна сусветнай статыстыцы на 100 душ насельніцтва ў Расіі вучняў было толькі 3, у той час як у Швейцарыі - 19, Германіі - 18, Англіі - 16, Аўстрыі - 12, Італіі - 9 [5, с. 33].

Да пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі існавалі Маладзечанская, Полацкая, Свіслацкая і Нясвіжская настаўніцкія семінарыі. Яны не маглі падрыхтаваць патрэбную колькасць народных настаўнікаў. Таму у 1909 г. была адкрыта Рагачоўская настаўніцкая семінарыя, у 1911 - Аршанская, у 1914 - Барысаўская, у 1915 - Гомельская, у 1916 - Бабруйская жаночыя семінарыі. Але з пачаткам першай імперыялістычнай вайны ў некаторых семінарыях заняткі спыніліся.

Першы настаўніцкі інстытут на тэрыторыі Беларусі адкрыты ў 1910 г. у Віцебску. У 1913 г. пачаліся заняткі ў Магілёўскім настаўніцкім інстытуце, а ў 1914 г. - у Мінскім.

Адной з форм навучання рамяству ў дарэвалюцыйнай Расіі былі рамесныя аддзяленні пры ніжэйшых агульнаадукацыйных школах. Тут рыхтавалі бондараў, пераплётчыкаў, вязальшчыкаў, залаташвачак, краўцоў, шаўцоў. У беларускіх губернях у 1910 г. было 15 такіх аддзяленняў, у якіх навучалася 609 чалавек.

Прафесіянальнае навучанне ажыццяўлялася таксама на курсах і ў майстэрнях. Вышэйшыя навучальныя установы адсутнічалі.

З 1915 г. прыпынілася развіццё народнай адукацыі на тэрыторыі Беларусі, дзе знаходзіўся Заходні фронт са стаўкай камандуючага фронтам у Мінску. Пачатковая школа, як арганічнае цэлае, распалася. Настаўнікі былі мабілізаваны ў дзеючую армію. За два з паловай гады вайны колькасць школьных камплектаў зменшылася на 740 і колькасць вучняў - на 29 600 чалавек, г.зн. на 46% ад агульнай колькасці

навучэнцаў [6, арк. 98]. У 1915 і 1916 гг. найбольпаму разгрому падвергліся Мінскі, Бабруйскі, Слуцкі і Чэрвенскі паветы, таму што заходнія часткі іх увайшлі ў паласу ваенных дзеянняў.

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. разбурыла капіталістычны грамадскі лад, устанавіла Савецкую ўладу. У новых умовах была разбурана і старая дваранска-буржуазная сістэма адукацыі. Перад Савецкай уладай паўсталі задачы перабудовы ўсёй школьнай сістэмы: правядзенне бясплатнай і абавязковай адукацыі ўсіх дзяцей, арганізацыя дашкольнага выхавання, здзяйсненне прынцыпаў працоўнай школы, свабоднай ад рэлігійнага ўплыву, ліквідацыя непісьменнасці, шырокае развіццё прафесійнай і рабочай адукацыі, забеспячэнне шырокага доступу рабочых і сялян у аўдыторыі вышэйшай школы [7, арк. 38].

Ужо ў першыя гады Савецкай улады было прынята больш за 50 дэкрэтаў, пастаноў, палажэнняў па пытаннях асветы.

30 лістапада 1917 г. была апублікавана пастанова Наркамасветы РСФСР “О реформе средней школы”, у якой было адзначана, што рашэнне жыццёва важных пытанняў школы павінна быць калегіяльным.

Выключна важнае значэнне ў справе перабудовы школы ў адпаведнасці з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва мела пастанова Наркамасветы РСФСР ад 11 снежня 1917 г. “О передаче дела воспитания и образования из духовного ведомства в ведение Народного комиссариата по просвещению”. У пастанове ўказвалася, што ўсе царкоўнапрыходскія школы, настаўніцкія семінарыі, духоўныя вучылішчы і семінарыі, і іншыя ўстановы духоўных ведамстваў, са штатамі, асігнаваннем, рухомай і нерухомай маёмасцю павінны былі быць перададзены Наркамасветы РСФСР.

Дэкрэтам ад 10 кастрычніка 1918 г. “О введении новой орфографии”, пачынаючы з малодшых класаў школы, выводзілася з ужытку старажытнаславянскае напісанне многіх слоў, зводзіліся да мінімуму запазычанні з замежных моў.

Дэкрэтам СНК РСФСР “Об отделении церкви от государства и школы от церкви” царква аддзялялася ад дзяржавы, школа аддзялялася ад царквы. Рэлігія была абʼяўлена

асабістай справай грамадзян.

У лютым 1918 г. пастановай Наркамасветы РСФСР былі адменены формы адзення і вучэбныя знакі ўсіх навучальных установў, якія падкрэслівалі саслоўную няроўнасць вучняў.

Згодна з пастановай Наркамасветы РСФСР ад 18 мая 1918 г. у школах уводзілася абавязковае сумеснае навучанне хлопчыкаў і дзяўчынак.

Правы працоўных савецкай дзяржавы на адукацыю былі заканадаўча замацаваны ў Канстытуцыі РСФСР, якая была прынята ў ліпені 1918 г. V Усерасійскім з’ездам Саветаў. У першай Савецкай Канстытуцыі запісана, што асноўнай задачай рэспублікі з’яўляецца прадастаўленне рабочым і бяднейшаму сялянству поўнай, усебаковай і бясплатнай адукацыі.

Дзяржаўная камісія па асвеце 27 лютага 1918 г. прыняла пастанову “О выборности всех педагогических и административно-педагогических должностей”. 17 ліпеня 1918 г. Дзяржаўная камісія па асвеце зацвердзіла Інструкцыю аб выбарах на вучэбныя і вучэбна-адміністрацыйныя пасады ў школах.

18 чэрвеня 1918 г. СНК РСФСР зацвердзіў “Палажэнне аб арганізацыі справы народнай адукацыі ў РСФСР”. У ім была вызначана структура кіравання народнай адукацыяй у дзяржаве: Дзяржаўная камісія па асвеце на чале з народным камісарам, губернскія, павятовыя, валасныя аддзелы народнай адукацыі пры выканкамах Саветаў.

16 кастрычніка 1918 г. былі апублікаваны два дакументы, якія мелі вялікае палітычнае і дзяржаўнае значэнне - “Дэкларацыя аб адзінай працоўнай школе” і “Палажэнне аб адзінай працоўнай школе РСФСР”. У іх былі вызначаны задачы школы і арганізацыйныя прынцыпы яе будаўніцтва. Школам РСФСР, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні Наркамасветы, давалася назва адзінай працоўнай школы. Дзяленне школ ліквідаваліся. Адзіная працоўная школа падзялялася на дзве ступені: першая - для дзяцей ад 8 да 13 гадоў і другая - ад 13 да 17 гадоў. Палажэнне і Дэкларацыя з’яўляліся важнейшымі дакументамі таго часу. Гэта была праграма дзейнасці савецкай школы.

У Беларусі з лістапала 1917 г. ствараліся новыя

абласныя, губернскія, павятовыя і валасныя савецкія органы па народнай адукацыі (саветы, камісарыяты і аддзелы па асвеце). У канцы лістапала - пачатку снежня 1917 г. былі створаны аддзелы народнай адукацыі пры мясцовых Саветах у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях, а 27 снежня 1917 г. - Камісарыят асветы Заходняй воласці.

Згодна з пастановай Дзяржаўнай камісіі па асвеце, у студзені 1918 г. пачалася ліквідацыя Віленскай вучэбнай акругі. Усе навучальныя ўстановы перайшлі ў распараджэнне аддзелаў народнай адукацыі, якія ўзначалілі працу па перабудове школьнай справы. У снежні 1917 - лютым 1918 гг. у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях было адкрыта больш за 2 300 пачатковых школ і каля 80 няпоўных сярэдніх і сярэдніх школ. Пачатковыя класы 15 валасцей Мінскага павета ў 1917/18 навучальным годзе прынялі каля 5 тысяч дзяцей. У Слуцкім павеце ў першай палове гэтага ж навучальнага года наведвалі школу больш за 8 тысяч вучняў, а ў другім паўгоддзі (да лютага 1918 г.) - ужо каля 10 тысяч. З 2 204 да 4 136.чалавек павялічылася за гэты перыяд колькасць вучняў школ Віленскага павета [7, с. 23].

Ажыццяўленне карэнных пераўтварэнняў у галіне школьнай адукацыі ўскладнялася ваеннымі дзеяннямі ў 1918-1920 гг. Акупацыі (у 1918 г. нямецкімі войскамі, у 1919-1920 гг. - польскімі) падверглася значная частка тэрыторыі Беларусі - Мінская губерня, заходнія паветы Віцебскай і Магілёўскай (з мая 1919 г. Гомельскай) губерняў. У Камісарыяце асветы Заходняй вобласці быў створаны аддзел народнай адукацыі ў складзе 11 пададдзелаў [8].

У ліпені 1918 г. у Маскве прайшоў з’езд настаўнікаў-беларусаў усіх тыпаў школ. Было вырашана захаваць усе эвакуіраваныя, па абставінах ваеннага часу, навучальныя ўстановы з усёй іх маёмасцю, прыступіць да распрацоўкі плана рээвакуацыі і стварэння новых школ на тэрыторыі Беларусі, аказаць матэрыяльную дапамогу рээвакуіраваным навучальным установам, для чаго стварыць камісію [9, арк. 66]. З’езд выказаў поўную падтрымку мерапрыемствам па рэформе народнай адукацыі.

Важную ролю ў станаўленні савецкай педагагічнай

адукацыі адыгралі Усерасійская нарада па падрыхтоўцы настаўнікаў і І Усерасійскі з'езд па асвеце, якія адбыліся ў жніўні 1918 г. у Маскве. На гэтых форумах былі вызначаны мерапрыемствы па пераўтварэнні настаўніцкіх інстытутаў у вышэйшыя педагагічныя навучальныя ўстановы. У кастрычніку 1918 г. (у ліку першых) Віцебскі настаўніцкі інстытут быў пераўтвораны ў вышэйшую педагагічную навучальную ўстанову - педагагічны інстытут. У снежні 1918г. Магілёўскі настаўніцкі інстытут пераўтвораны ў педагагічны [10, с. 22]. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў у пачатку 1919 г. Мінскі настаўніцкі інстытут быў рэарганізаваны ў педагагічны інстытут з чатырохгадовым тэрмінам навучання.

У жніўні 1919 г. у Маскве адбылася Другая нарада па рэформе педагагічных навучальных установў. Нарада ўхваліла рэарганізацыю педагагічных інстытутаў і некаторых семінарый і прыняла статут інстытутаў народнай адукацыі. Да канца 1920 г. на тэрыторыі Беларусі функцыяніравалі Віцебскі, Магілёўскі і Мінскі інстытуты народнай адукацыі.

Разам з рэарганізацыяй дарэвалюцыйных настаўніцкіх інстытутаў у дзяржаве здзяйснялася рэформа настаўніцкіх семінарый. Усе настаўніцкія семінарыі былі пераўтвораны ў розныя ўстановы згодна з "Временным положением об учительских семинариях", распрацаванага Усерасійскай нарадай дзеячаў па падрыхтоўцы настаўнікаў. Згодна з "Временным положением..." змяняўся ўвесь вучэбна-выхаваўчы працэс старых семінарый з дырэктарамі і класнымі настаўнікамі, уводзілася калегіяльнае кіраванне. На пачатак 1919 г. на тэрыторыі Беларусі было 11 настаўніцкіх семінарый, якія рыхтавалі настаўнікаў для школ І ступені [10, с. 30].

Неабходнасць у адначасовым існаванні інстытутаў народнай адукацыі і настаўніцкіх семінарый страчвалася. У ліпені 1919 г. Наркамасветы РСФСР прыняў рашэнне пераўтварыць усе настаўніцкія семінарыі у педагагічныя курсы для падрыхтоўкі настаўнікаў школ І ступені, ці інстытуты народнай адукацыі. У 1917-1920 гг. у дзяржаве былі арганізаваны педагагічныя курсы трох тыпаў: пастаянныя курсы двухгадовага тэрміну навучання, аднагадовыя курсы з дзесяцімесячным тэрмінам навучання і кароткатэрміновыя

курсы з шасцітыднёвым тэрмінам навучання.

Да канца грамадзянскай вайны педагагічныя навучальныя ўстановы дарэвалюцыйнай Беларусі былі ў асноўным пераўтвораны і была створана сістэма педагагічнай адукацыі.

Вясной 1919 г. прайшлі перавыбары настаўнікаў, у выніку якіх настаўнікі, якія не падтрымлівалі Савецкую ўладу, былі звольнены з работы. Каб папоўніць школы адданымі Савецкай уладзе настаўніцкімі кадрамі, у 1919-1920 гг. у Мінскай, Віцебскай і Гомельскай губернях былі адкрыты кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў.

У адпаведнасці з рашэннямі І Усерасійскага з’езда па асвеце (жнівень 1918 г.) камісарыят па асвеце Заходняй вобласці ў лістападзе 1918 г. прыняў спецыяльную пастанову аб рэарганізацыі школ, згодна з якой ліквідаваліся духоўныя семінарыі і епархіяльныя вучылішчы, а замест шматлікіх тыпаў навучальных установ у Беларусі ўводзілася адзіная працоўная школа дзвюх ступеняў.

У 1918 г. былі ўведзены спецыяльныя дзіцячыя карткі і Наркамасветы было даручана арганізоўваць сталовыя пры школах, забяспечваць іх прадуктамі харчавання шляхам падатковага абкладання насельніцтва. 4 студзеня 1919 г. быў падпісаны дэкрэт аб стварэнні Савета абароны дзяцей, у абавязкі якога ўваходзіла барацьба з дзіцячай беспрытульнасцю, арганізацыя дзіцячых садоў і калоній, іх фінансаванне, эвакуацыя і размяшчэнне дзяцей з галадаючых губерняў. У Мінску ствараюцца 3 дзіцячыя дамы, у Бабруйску 3 дзіцячыя сады і 3 дзіцячыя дамы. У іншых гарадах і мястэчках на базе былых памешчыцкіх маёнткаў наладжваюцца дамы, калоніі і камуны. Былі ў гэты час створаны і камісіі па справах непаўналетніх, якія ўстанаўлівалі новыя прынцыпы барацьбы з дзіцячай злачыннасцю. Суды і турмы для непаўналетніх ліквідаваліся.

Прыкметны след у гісторыі савецкай асветы пакінулі Літвінавіцкая і Леменская школы-камуны, ініцыятарам стварэння якіх быў Панцеляймон Мікалаевіч Лепяшынскі. П.М. Лепяшынскі - выдатны педагог, у савецкі перыяд многія свае працы прысвяціў сацыялістычным пераўтварэнням у галіне

народнай асветы, новаму зместу навучання ў школе, прынцыпам і метадам навучання і камуністычнага выхавання, народнаму настаўніку і яго ролі ў ажыццяўленні культурнай рэвалюцыі ў нашай краіне. Ён быў арганізатарам першых доследна-паказальных працоўных школ-камун у Маскве, Беларусі, Туркестане. У 1919 г. Мінскім аддзелам народнай адукацыі ў маёнтку Весялоўка, была створана вучнёўская сельскагаспадарчая камуна. У камуну ўвайшлі 40 навучэнцаў школы II ступені, настаўнікі і спецыялісты па сельскай гаспадарцы. У камуне было 64 дзесяціны зямлі, занятыя пад лес і луг, для агарода 15 дзесяцін [11, с. 15].

У выніку ўтварэння ССРБ у студзені 1919 г. быў створаны Народны камісарыят асветы ССРБ. У лютым 1919 г. Літва і Беларусь аб’ядналіся ў адзіную Літоўска-Беларускую ССР. За час існавання ЛітБела пытаннямі народнай адукацыі ў Беларусі займаліся Наркамасветы ЛітБела і аддзел народнай адукацыі Літгубрэўкама. Важнейшым дакументам па пытаннях асветы з’явіўся дэкрэт Савета Народных Камісараў Літвы і Беларусі “Аб рэарганізацыі школьнай справы”. Гэтым дэкрэтам уводзілася адзіная працоўная школа творчай працы. Неад’емнымі ўмовамі пры правядзенні гэтай работы былі: агульнадаступнасць, агульнаабавязковасць і свецкасць школ.

Навучанне ў школах абедзьвюх ступеняў у Беларусі з’яўлялася бясплатным, супольным для хлопчыкаў і дзяўчынак, наведванне школы было абавязковым для ўсіх дзяцей школьнага ўзросту. Вызначалася нарматыўная колькасць вучняў на аднаго настаўніка - 25 чалавек [12, с. 17-18].

Акупацыя польскімі войскамі часткі тэрыторыі Беларусі вясной 1919 г. прыпыніла працу па рэарганізацыі школьнай справы і нанесла ёй вялікі ўрон. Ужо ў студзені 1920 г. большая частка сярэдніх школ была “упанствавана”. Газета “Звезда”, якая выходзіла ў Смаленску, пісала аб польскай акупацыі: “Усе школы і вучылішчы закрыты. Пачалі функцыяніраваць толькі польскія. Але было аб’яўлена, што школы на іншых мовах могуць быць адкрыты на прыватныя сродкі, з дазволу ўлад. Усе няпольскія цэнтры закрыты, і дзеці беднаты літаральна апынуліся выкінутымі на вуліцу” [13].

Начальнік Мінскай акругі Рачкоўскі заявіў, што

дзяржаўнай мовай на Беларусі з'яўляецца польская мова, а мясцовай мовай большасці насельніцтва - беларуская. Усё справаводства ў дзяржаўных установах будзе весціся на польскай мове. Школы з выкладаннем на мясцовых мовах могуць мець падтрымку з боку органаў мясцовага самакіравання горада і земства [14].

Летам 1920 г. акупанты абазначылі ўвесь свой шлях паспешнага адступлення пажарышчамі і руінамі школьных будынкаў і культурна-асветніцкіх устаноў. У адной толькі Мінскай губерні было знішчана 50% школьных будынкаў [6, арк. 98].

У жніўні 1920 г. тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад палякаў. Быў створаны аддзел народнай адукацыі, які ў жніўні 1920 г. перайменавалі ў Камісарыят асветы ССРБ, а ў снежні 1920 г. быў створаны Наркамасветы ССРБ.

Для паспяховага выканання вялікіх задач у галіне школьнага будаўніцтва было неабходна падрыхтаваць новы кантынгент педагагічнага персаналу, нягледзячы на іншыя праблемы. Ужо ў першыя месяцы Савецкай улады сярод настаўніцтва вызначыліся тры асноўныя палітычныя накірункі. Першы накірунак быў прадстаўлены прывілеяванай і матэрыяльна забяспечанай да рэвалюцыі групай настаўнікаў гімназій і іншых навучальных устаноў. Гэта частка настаўнікаў выступала супраць Савецкай улады. Другі накірунак быў прадстаўлены настаўнікамі гарадскіх і сельскіх школ. Гэта частка настаўнікаў спачатку пахіснулася ў бок ворагаў пралетарскай дыктатуры, а пазней стала супрацоўнічаць з органамі народнай адукацыі. Трэці накірунак быў прадстаўлены вялікай колькасцю сельскіх настаўнікаў, выхадцаў з асяроддзя рабочых і сялян. Гэта частка настаўнікаў са спачуваннем сустрэла Кастрычніцкую рэвалюцыю і адразу ж уключылася ў будаўніцтва савецкай школы.

Урад рэспублікі і Камуністычная партыя Беларусі вялі рашучую барацьбу з варожымі выпадамі старога настаўніцтва. Дзяржаўнымі органамі сярод настаўніцтва праводзілася ідэалагічная і арганізацыйная работа. Быў створаны Саюз работнікаў асветы і сацыялістычнай культуры.

Такім чынам, Савецкая ўлада здзяйсняла актыўны пошук

форм прафесійнай арганізацыі настаўніцтва. Сярод яго праводзілася ідэалагічная і арганізацыйная работа. Дзяржава праяўляла клопат аб паляпшэнні матэрыяльнага становішча народных настаўнікаў, ліквідацыі іх палітычнай непісьменнасці, азнаямленні з прынцыпамі адзінай працоўнай школы. Арганізоўваліся таксама перавыбары педагагічнага персаналу. Дзяржаўная палітыка ў галіне адукацыі насіла класавы характар. Яна праводзілася ў інтарэсах народа і для народа і была накіравана на ліквідацыю ідэйнай раз'яднанасці паміж асобнымі групамі працаўнікоў асветы, прыцягванне да педагагічнай дзейнасці выхадцаў з рабочых і сялян, павышэнне ролі настаўніцтва ў будаўніцтве новага сацыялістычнага грамадства.

**Літаратура:**

1. НА РБ, ф. 101, воп.1, спр. 3603.
2. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 т. Т. 1. А-Беліца / Беларус. Энцыкл.; Рэд. кал.; М.В. Біч і інш.; Мінск. Бел. Эн., 1993. - 494 с.
3. Всеобщее внешкольное образование. Минская Губернская Земская Управа (Журнал для земского избирателя) // Наше земское дело. -1918. -№7. -30 июня. -С. 3-6.
4. Культурное строительство БССР. Издание УМХУ БССР. Минск. 1940. –109 с.
5. Статыстычны аддзел // Беларускі каляндар. Вільня. -1914. -С. 33.
6. НА РБ, ф. 42, воп. 1, спр. 603.
7. Станаўленне новай школы ў Беларусі // Нар. асвета. -1966. -№5. -С. 21-29.
8. Хроніка. Падручнікі для беларускіх школ // Вольная Беларусь. -1918. -№22-23. -23 чэрв, -С. 168.
9. НА РБ, ф. 4, воп. 1, спр. 79.
10. Новик Е.К. Формирование кадров народного образования Белоруссии (1917—1941). -Минск: Наука и техника, 1981, -295с.
11. "Школяры-коммунары" // Школа и революция. -1919.-№22-23 (№2. 07.07.1919). -С. 15.
12. Декрет о реорганизации школьного дела // Школа н культура Советской Белоруссии.-1919. -№1. -С. 16-18.

13. В польской оккупации (Минской губ.) // Звезда. -1919. -26 октября. -С. 5-6.
14. Полонизация Белоруссии // Звезда. -1919. -19 октября. -С.9.